А пакуль я гадоў на пяць з гакам адлучуся з энцыклапедычнага выдавецтва, не парываючы з ім творчых сувязяў і не паслабляючы таго ўплыву, які мог аказваць на далейшае развіццё энцыклапедычнай справы ў рэспубліцы.

## ІНСТЫТУТ КУЛЬТУРЫ

Зусім нечакана для самога сябе я стаў яго першым рэктарам. Адбылося гэта ў 1975 годзе пасля таго, як быў адсвяткаваны выхад у свет усіх 12 тамоў Беларускай Савецкай Энцыклапедыі. Гэта было не толькі свята яе стваральнікаў, але і важная з'ява ў культурна-палітычным жыцці ўсёй Беларусі. Нацыя атрымала даволі грунтоўную і падрабязную сваю біяграфію, якая засведчыла яе старажытнасць, дзяржаўнасць, цывілізаванасць, высокі культурны, духоўны і навуковы патэнцыял.

Так здарылася, што пасля Украіны мы апярэдзілі з выданнем першай нацыянальнай Энцыклапедыі ўсе іншыя саюзныя рэспублікі. Некаторым з іх патрабавалася каля двух дзясяткаў гадоў, каб завяршыць гэту важную і нялёгкую работу.

Грамадскасць Беларусі прыязна прыняла нашу працу. Дзяржава высока ацаніла неардынарную з'яву ў гісторыі і жыцці нацыі і групе найбольш актыўных стваральнікаў БелСЭ прысвоіла званне лаўрэатаў Дзяржаўнай прэміі Беларусі. Мне асабіста акрамя гэтага было нададзена яшчэ і званне заслужанага работніка культуры рэспублікі. Настрой быў добры, перспектывы на новыя энцыклапедычныя выданні — захапляючыя, галоўны рэдактар разумны, памяркоўны і ў вярхах уплывовы. Як казаў паэт: «Твори, выдумывай, пробуй!» І раптам…

Гаворка з Пятром Міронавічам была нядоўгай, але вельмі паважнай і прыемнай. Павіншаваўшы мяне з лаўрэацтвам, ён адзначыў, што не памыліўся ў свой час з маім прызначэннем «начальнікам штаба» да Броўкі, дзе я, на яго думку, зарэкамендаваў сябе і добрым арганізатарам, і здольным навукоўцам. Не абмінуў і маю вузкую спецыялізацыю ў літаратуры.

— Прачытаў ваш першы зборнік п'ес, — і дадаў, відаць, улавіўшы маё здзіўленне, — у мяне дачка рыхтуе навуковую працу па сучаснай беларускай драматургіі, так што я здабыткі нашых драматургаў нядрэнна ведаю.

Пажадаў мне асабістых поспехаў, зрабіў паўзу, прыпаліў цыгарэту, зацягнуўся, пусціў дым пад стол і руку з цыгарэтай туды ж схаваў — была ў яго такая звычка — і сказаў:

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

— Здаецца мне, што работа рэктарам Інстытута культуры будзе па вас, а вы па ёй…

І стаў я рэктарам яшчэ нястворанага і недабудаванага інстытута. Менш чым за год я яго дабудаваў, штат выкладчыкаў часткова перайшоў з бібліятэчнага факультэта Мінскага пед-інстытута, часткова з тэатральна-мастацкага інстытута, каго не хапала, даўкамплектаваў, усё начынне закупіў, разам з выкладчыкамі і студэнтамі па паверхах разнёс, з імі ж і ў калгасе на бульбе пабыў, і першы семестр правучыўся — яны на сваіх пасадах, а я на сваёй, рэктарскай. Пераканаўся, што сапраўды не святыя гаршкі лепяць, набыў, як цяпер кажуць, імідж кіраўніка дэмакратычнага, даступнага, справядлівага, да п'яніц, гультаёў і зладзеяў строгага ў рамках законнасці і гуманнасці. Выкладчыкі і студэнты гэта пацвердзілі пасля таго, як я нечакана пакінуў інстытут не па сваёй волі. Пісалі пісьмы ў ЦК КПБ, каб мяне вярнулі ў інстытут, калі з новым і занадта крутым рэктарам не зладзілі. Гэта, вядома ж, было прыемна, але справы змяніць не магло. Пройдуць гады, а я не перастану шкадаваць, што пагадзіўся тады пакінуць інстытут, які сапраўды быў па мне. Упэўнены, што і я яму не здрадзіў бы па сваёй волі. Інстытут культуры быў тым асяродкам, дзе можна было б здзейсніць шмат задум агульнаадукацыйнага характару.

Мяркую, што інстытут быў бы для мяне добрай і надзейнай засцярогай ад таго цкавання і дыскрэдытацыі, якой я як драматург не пазбег, пакінуўшы яго. Але не пра мяне тут гаворка. Калектыў інстытута быў падняты і акрылены марай стварыць незвычайную навуковую установу, якая б стала своеасаблівым цэнтрам, асяродкам, у якім меркавалася сабраць народныя таленты з усіх куткоў Беларусі і падрыхтаваць іх носьбітамі нацыянальнай ідэі. Ужо тады былі людзі і выспявалі перадумовы, каб пры інстытуце стварыць свой тэатр, народныя ансамблі, фальклорныя калектывы, аркестры духавых і народных інструментаў, павярнуць тварам да чытача бібліятэчны факультэт, арганізаваць вывучэнне і прапаганду беларускай літаратуры, любымі даступнымі сродкамі паўплываць на стан вывучэння народам сваёй роднай беларускай мовы.

…Прайшлі гады. Мінскі інстытут культуры дасягнуў паўналецця і абсалютна заканамерна перайшоў у новы стан свайго быцця — стаў Беларускім універсітэтам культуры. Усё атрымалася натуральна, як і павінна было стацца, і тут няма чаму здзіўляцца.

Здзіўляцца можна хіба таму, як няўмольна і імкліва бяжыць час, пакідаючы за сабою не толькі горкія, але і радасныя ўспамі-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ны. Што ні кажыце, а прыемна ўсведамляць, што і ты меў некалі дачыненне да справы пачэснай, для людзей і сваёй зямлі карыснай і не такой ужо простай і бясхмарнай.

Не ў лёгкія часы будаваўся і ствараўся Мінскі інстытут культуры. Не простым было яго шматгадовае станаўленне і пераход у іншую вышэйшую ўніверсітэцкую якасць. Але як бы там ні было ў тыя часы, што ўжо за плячыма найважнейшай навучальнай установы дзяржавы, сёння галоўнае ў тым, што гэта ўстанова ёсць, што яна худа-бедна, а працуе на адраджэнне культуры, нацыянальнай свядомасці народа і яго гістарычнай памяці, без чаго не бывае ні годнай Нацыі, ні сапраўднай Дзяржавы, назву якіх можна было б пісаць з вялікіх літар.

Можна лічыць сябе шчаслівым, калі намаганнямі многіх і многіх самаадданых людзей прадаўжаецца любая справа, здзяйсняюцца твае запаветныя мары. Што да Беларускага ўніверсітэта культуры, то для мяне яны здзейсніліся і здзяйсняюцца, хоць зноў жа і на гэты раз з цяжкасцямі неверагоднымі. Тым, хто іх перамагае, мой нізкі паклон і шанаванне.

...Нібы ўчора трымаў у руках урадавую пастанову аб адкрыцці ў Мінску Інстытута культуры! Нібы ўчора падпісваў акт аб прыёмцы ў будаўнікоў недабудаванага будынка. Нібы ўчора разам са студэнтамі і выкладчыкамі занёс на дзявяты паверх апошняе з дваццаці піяніна. (Запчасткі да грузавога ліфта будаўнікі ўкралі вельмі своечасова.) К гэтаму ж перадапошняму дню перад першым навучальным годам, які пачаўся ў кастрычніку, выявілася, што ў будынку не працуе проціпажарная сістэма, што само па сабе ацэньвалася як сітуацыя надзвычайная. І ці мала якіх іншых праблем, нечаканасцяў і недарэчнасцяў здараецца ў вялікай справе, тым больш калі яна традыцыйна робіцца ў нас спачатку праз пень-калоду, каб потым перайсці да тэмпаў ударна-пажарных...

З цеплынёй і ўдзячнасцю ўспамінаю сёння дзясяткі адказных, добразычлівых, па-чалавечы прыязных людзей, якія мелі дачыненне да стварэння, будаўніцтва і адкрыцця інстытута. Мне сёння здаецца, што менавіта да гэтай навучальнай установы былі тады нейкія асаблівыя адносіны. І вырашальныя з іх былі з боку Ніны Лявонаўны Сняжковай — на той час намесніка старшыні Савета Міністраў, Мікалая Максімавіча Мяшкова — міністра вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, Фёдара Мікалаевіча Капуцкага — яго намесніка па будаўнічых, забеспячэнскіх, кадравых і бог ведае якіх яшчэ справах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Так шчасліва склалася, што самымі першымі маімі памочнікамі ў арганізацыі навучальнай, гаспадарчай і фінансавай дзейнасці наваствораная навучальнай установы былі самаадданыя людзі, а сярод іх прарэктары У. У. Зубец і І. К. Бяка, дэканы В. Е. Лявончыкаў і А. І. Смагін, загадчыкі кафедраў Б. І. Бранавіцкі, А. П. Грыцкевіч, З. М. Клецкая, А. С. Мікалаеў, В. С. Папоў, Р. А. Ровіна, Н. П. Федзюкова, галоўны бухгалтар М. Г. Іванова, выкладчык І. Ф. Селязнёў, начальнік аддзела кадраў Т. А. Кароткіна і многія іншыя. Хіба ўсіх пералічыш! Калі існуе тэлепатыя, няхай тыя, хто сёння з намі, пачуюць мае пажаданні ім здароўя, цярпення і моцы ў барацьбе за лепшую долю. А перад тымі, хто за трыццаць год пакінуў нас, схіляю галаву і вінюся за магчымую крыўду. Іх цагліны ў падмурку годнага збудавання, якім стаў універсітэт.

Роздум будзіць успаміны. А іх безліч: і сур'ёзных, і смешных, і нават кур'ёзных. І ўсе пра нешта сведчаць у нашым жыцці. Сёння нават нейкія непрыемнасці ці няпростыя жыццёвыя сітуацыі таго, ужо далёкага цяпер часу ўспамінаюцца як горкія жарты, вядома ж, калі не траціць пачуцця гумару.

Ну, чаго варты, напрыклад, такі: храм навукі і культуры — будыніна інстытута і прылеглая да яе тэрыторыя «здадзены ў эксплуатацыю». Будаўнікі расстаўляюць-размяшчаюць так званую архітэктуру малых формаў, разбіваюць кветнікі і газоны, абсаджваюць іх па перыметры і не абы-чым, а ружамі. Працуюць да прыцемкаў, бо, як заўжды, не паспяваюць у тэрмін. А раніцой адкрыццё храма, урачыстае ўручэнне сімвалічнага ключа, мітынг на вуліцы і шампанскае ў кабінеце рэктара, першы званок, першыя заняткі студэнтаў у цудоўных аўдыторыях за сталамі і партамі, што пахнуць фарбай, за навенькімі раялямі і цымбаламі.

А пасля ўсёй гэтай даўночаканай урачыстасці — вытаптаныя і здратаваныя кветнікі і газоны, прымятыя і паламаныя ружы, размаляваныя ва ўсе колеры сталы і парты. Раніцой наступнага дня за паўгадзінкі да заняткаў выходжу на прыступкі параднага пад'езда і назіраю, хто ж пойдзе нацянькі па пратаптаных сцежках праз газоны і кветнікі?..

Пайшлі і студэнты, і выкладчыкі, нават не абтрэсшы ногі ад чарназёму, пашыбавалі ў «храм». Праўда, усе ветліва падароўкаліся з рэктарам, не ўяўляючы, чаго ён тырчыць тут на прыступках пад дробным восеньскім дожджыкам. А рэктар думае: «Божа літасцівы, колькі ж спатрэбіцца намаганняў, каб са студэнтаў зрабіць культурных людзей, а з выкладчыкаў — сваіх паплечнікаў у гэтай святой справе».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Кінулася ў вочы, што пасля свята адкрыцця інстытута і першага дня заняткаў многія выкладчыцы былі апрануты ў нешта шэрае і безгустоўнае і выглядалі куды горш за студэнтак, а выкладчыкі-мужчыны амаль усе былі ў памятых, неадпрасаваных гарнітурах і нічым асаблівым не адрозніваліся ад студэнтаў.

Пасля заняткаў сабраў усіх выкладчыкаў на пяцімінутку, павініўся, што не здолеў арганізаваць ахову газонаў і кветнікаў і папрасіў кожны дзень прыходзіць на працу, як на вяселле.

Калі адчуў, што мяне не разумеюць, патлумачыў: прыходзіць у свежых сарочках і лепшых, абавязкова адпрасаваных, касцюмах пры новых гальштуках ці без іх. І яшчэ параіў прыхапіць заўтра з сабою, колькі хто зможа, лёзаў ад брытваў, раздаць іх студэнтам і разам з імі на першым жа ўроку саскрэбсці ўсе надпісы і малюнкі са сталоў і партаў. Паабяцаў, што сам буду скрэбсці разам з усімі.

Сходку закрыў, пазбавіўшы яе ўдзельнікаў права на «прения».

Кажуць, што валявым спосабам закладзеная традыцыя жыве па сёння выключна на добраахвотных пачатках, а зацягнутыя мной гальштучкі цяперашні рэктар — шаноўная Ядвіга Дамінікаўна Грыгаровіч — адпускаць не дазваляе.

І яшчэ тры кадравыя «анекдоты».

Студэнты робяць рэктару пісьмовы запыт, каб даведацца, ці можа савецкі выкладчык-канцэртмайстар называць студэнтаў дурнямі, тупіцамі, аболтусамі, ідыётамі і іншымі падобнымі эпітэтамі!

Выклікаю канцэртмайстра і стаўлю ёй студэнцкія пытанні. Канцэртмайстар маўчыць. Тады я пытаюся, што будзем рабіць: вочную стаўку са студэнтамі, ствараць спецыяльную камісію або…

Канцэртмайстар выбірае «або» і просіць два тыдні. Даю чатыры. Яна звальняецца праз тры.

А то прыходзіць да рэктара цэлая вучэбная група студэнтаў і пісьмова просіць звольніць выкладчыка. Тлумачаць, што ён кожны дзень п’яны. Сёння мы, маўляў, увесь семінар прасмяяліся…

— ?

— Ён цэлую гадзіну спрабаваў устаяць на адной назе, каб зашнураваць чаравік на другой і гойдаўся, а мы назіралі: упадзе ці не ўпадзе…

Або іншы выпадак, і зноў жа кадравы. Прашу ўжо іншага выкладчыка і па іншай пікантнай прычыне як-небудзь звольніцца па ўласным жаданні, каб яму не рабіць брыдка ды і наогул не ствараць канфлікту і лішняй агалоскі таго, што не прыбавіць

аўтарытэту ні інстытуту, ні выкладчыку. Што ні кажы, а ў нас усё ж Інстытут культуры. Той глядзіць на мяне блакітнымі, як неба, вачыма і з усмешкай кажа:

— Не, шаноўны Алесь Лявонавіч, вы самі хутчэй звольніцеся, чымся я.

— ?

— Днямі вам прапануюць пасаду або міністра культуры, або загадчыка аддзела культуры ЦК…

— ?

І такі на два тыдні раней за мяне «ўгадаў» мой лёс… І даволі доўга пасля мяне працаваў у інстытуце. Так што, як бачыце, былі ў штаце і асабліва дасведчаныя кадры…

Пра іншыя цікавыя эпізоды з майго, на вялікі жаль, нядоўгага рэктарства лепш расказаць у жанры тоста падчас чарговага юбілею ўніверсітэта. Ніколі не будзе позна кінуць заклік: няхай жа наш, цяпер ужо ўніверсітэт, калі не па назве, то па сутнасці стане і назаўсёды будзе сапраўдным Беларускім Нацыянальным Універсітэтам культуры і мастацтваў!

Усё іншае ў яго ўжо — дай бог любому іншаму ўніверсітэту.

## КАНДРАТ КРАПІВА

Гэта другі акадэмік у маім лёсе пасля Броўкі. Два словы — імя і прозвішча. І перад намі магутная, незвычайная, амаль легендарная постаць апостала беларускай культуры ў самым шырокім сэнсе гэтага словавызначэння. Скарына, Купала, Колас, Крапіва — на такіх і да іх падобных трымаецца і выходзіць з любых нягод нацыя Беларусаў. Божай міласцю драматург, выдатны байкапісец XX стагоддзя, таленавіты празаік, вучонымовазнавец, грамадскі дзеяч, народны пісьменнік, акадэмік, доктар філалагічных навук, Герой Сацыялістычнай Працы, заслужаны дзеяч навукі — і ўсё гэта адзін чалавек — Кандрат Кандратавіч Атраховіч (Кандрат Крапіва).

Ён равеснік амаль цэламу стагоддзю. Усе беларусы, акрамя, можа, толькі тых, хто яшчэ не пазбавіўся таўра Тулягі, аддаюць яму сваю любоў і павагу.

Ужо даволі даўно нацыя развіталася са сваім слынным сынам, а ўсё здаецца, што ён побач з намі, сярод нас. Відаць, гэта пачуццё ад таго, што створанае ім жыве, што народ ім карыстаецца, што скарбніца яго духоўнага багацця і глыбокая, і шырокая. Кандрат Крапіва пакінуў нам усё, што меў, усё, што паспеў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ